# Ратуемся спадчынай

✓ **8 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі Канстанціна Цыбульскага **«Я застаюся тут»**. Аўтар – паэт-песеннік, ураджэнец Маладзечаншчыны, выдаў шэраг зборнікаў паэзіі і песень. Новая кніга ўбачыла свет у выдавецтве «Беларусь» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Вершы прасякнутыя яднаннем з родным бацькоўскім кутком, любоўю да краю, дзе нарадзіўся, да яго непаўторнай прыроды. Пад час сустрэчы адбылася гутарка з аўтарам. Аб падрыхтоўцы зборніка распавяла вядучы спецыяліст выдавецтва «Беларусь» Анжэла Садоўская. Выступілі на імпрэзе народны артыст Беларусі У. Яцкевіч, артыст Белдзяржфілармоніі А. Балотнік, салісты эстрады А. Саванец, Д. Хмяльніцкая, В. Альшанская, артыст В. Каняхін, народны ансамбль «Пліса» і арт-група «Золотая мельница».




*Фота з сайта nlb.by*